Весці БДПУ. Серыя 1. 2021. № 1. С. 93–96

УДК 81'367.623:[811.161.3+811.111]

ПЕЯРАТЫЎНЫЯ ДРУГАСНЫЯ НАМІНАЦЫІ (НА МАТЭРЫЯЛЕ СУБСТАНТЫВАЎ БЕЛАРУСКАЙ І АНГЛІЙСКАЙ МОЎ)

В. А. Мусіенка,
аспірант кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка

Паступіў у рэдакцыю 21.01.21.

UDC 81'367.623:[811.161.3+811.111]

PEJORATIVE SECONDARY NOMINATIONS (ON THE MATERIAL OF SUBSTANTIVES IN THE BELARUSIAN AND ENGLISH LANGUAGES)

V. Musiyenka,
Postgraduate Student of the Department of Linguistics and Linguodidactics, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank

Received on 21.01.21.

У артыкуле разглядаюцца пеяратыўныя другасныя намінацыі, якія засведчаны ў беларускай і англійскай мовах. Выяўляюцца іх сэнсавая напоўненасць, спецыфіка канататыўнага зместу, а таксама зыходныя лексіка-семантычныя варыянты, якія паслужылі для ўтварэння другасных пеяратыўных намінацый (зоамарфізмы, фітонімы, артэфакты). Устанаўліваюцца семантычныя адносіны паміж лексічнымі адзінкамі беларускай і англійскай моў.

Ключавыя словы: беларуская мова, англійская мова, назоўнік, другасныя намінацыі, канатацыя, пеяратыўнасць, метафара.

The article considers pejorative secondary nominations that are certified in the Belarusian and English languages. It reveals their meaning fullness, specificity of connotative contents and original lexical-semantic variants which have served for derivation of secondary pejorative nominations (zoomorphs, phytonyms, artefacts). It establishes the semantic relations between lexical units of the Belarusian and English languages.

Keywords: the Belarusian language, the English language, noun, secondary nominations, connotation, pejorativeness, metaphor.

Катэгорыя ментальнасці адносіцца да ўніверсалій і актыўна даследуецца ў псіхалогіі, філасофіі, культуралогіі [1–9].

Моўная рэпрэзентацыя кагнітыўных структур уяўляе сабой шматузроўневую і шматкампанентную структуру, ў якой вылучаюцца першасныя і другасныя ЛСВ. Другасныя намінацыі ў сваёй большасці ўтвараюцца на базе зыходных значэнняў існуючых у мове слоў, якія пэўным чынам трансфармуюцца і суадносяцца з новымі фрагментамі рэальнасці. Сукупнасць слоў, выразаў, паняццяў і канцэптаў, якія адносяцца да мыслення, некаторыя навукоўцы называюць «мэнтальнай мовай», або «мовай думкі», і тлумачаць яе як «метамова», на якой задаюцца адзінкі канцэптуальнай сістэмы і/або апісваюцца ментальныя рэпрэзентацыі для значэння натуральнамоўных выразаў» [10, с. 100].

У артыкуле на матэрыяле другасных ЛСВ назоўнікаў разглядаюцца ментальныя намінацыі, у якіх адлюстроўваюцца пеяратыўны (негатыўны) фрагмент корпуса канатацыі. Мэта – устанавіць спецыфіку рэпрэзентацыі другасных ментальных ЛСВ у беларускай і англійскай мовах. Паняцце *mentality* вызначаецца ў англамоўных псіхалагічных слоўніках як «якасць розуму, якая характарызуе асобнага індывіда або клас індывідаў»; «абагульненне ўсіх характарыстак, якія адрозніваюць розум», «здольнасць або сіла розуму», «устаноўкі, настрой, змест розуму», «вобраз думак, кірунак або характар разважанняў» і, нарэшце, як «сума разумовых здольнасцей або магчымасцей, якія адрозніваюцца ад фізічных» [6].

У залежнасці ад тэматычнай прыналежнасці першасных ЛСВ выяўляецца характар іх праецыравання на ментальныя сферы, устанаўліваюцца тыя ці іншыя сцэнарыі ўтварэння другасных ЛСВ. Ва ўтварэнні катэгорый ментальнасці ўдзельнічаюць найменні заонімаў, артэфактаў, фітонімаў і іншых лексіка-тэматычных груп, якія, займаючы важнае месца ў сістэме матэрыяльных каштоўнасцей любога народа, нараджаюць даволі разнастайныя і ўстойлівыя асацыяцыі [11, с. 31].

Ментальныя намінацыі падраздзяляюцца на дзве групы. У першай з іх характарызуюцца такія якасці, як разумовая здольнасць, лагічнасць. У другую групу ўключаюцца назвы пеяратыўнага характару, звязаныя з указаннем тупасці, глупства, дурноты, бесталковасці, невуцтва. Гэтыя дзве групы знаходзяцца ў асіметрычных адносінах па прычыне таго, што колькасць негатыўных ацэнак значна большая, чым пазітыўных. Гэта ў пэўнай ступені тлумачыцца тым, што станоўчыя якасці чалавека звычайна адносяцца да нормы і не патрабуюць пэўных дадатковых азначэнняў, тлумачэнняў. Негатыўныя канатацыі звязаны з адхіленнямі ад нормы і, як правіла, фіксуюцца з мэтай іх выпраўлення, выкаранення гэтых недахопаў. Адмоўная канатацыя часцей за ўсё выяўляецца ў субстантывах, першасныя ЛСВ якіх называюць жывёл, артэфакты, расліны і інш.

Асацыяцыі чалавека з жывёламі адносяцца да самых частотных, справядліва зазначае Л. Нікіціна, дэманструючы вынікі анкетавання і ілюстрацыі тыпу дурны, як асёл (*індык, мядзведзь, воўк, варона, курыца, малпа, баран*); неадукаваны, цёмны, як казёл (*курыца, бегемот, слон*) [12, с. 118].

Да адных з асноўных негатыўных якасцей чалавека адносяцца яго абмежаванасць, адсталасць, глупства, упартасць і інш. У працэс метафарызацыі ўключаюцца беларускія назоўнікі *баран, асёл, ішак, авечка, цяцера, певень*

‘пра тупога, някемлівага чалавека’: *Напэўна б, гэты факт не ўспомніў я, Каб на парозе прыклад не стаяў: Такі казёл (магчыма, і баран) / Штодня вылазіць на экран / І заклікае быдла за сабой, – / Пра рай блякоча, а вядзе на бой* (В. Зуёнак), ‘пра упартага, неразумнага чалавека’: *Божа, які асёл! Які ён асёл!.. Каб прыехаць адзін, усяго адзін толькі прыпынак, ён не сышоў следам за ёй...* (А. Васілевіч); *А твой бацька, ішак сапраўдны, упрэцца ў сваё, і хоць яго забі* (Л. Левановіч), ‘пра някемлівага дурнаватага чалавека’: *Ці ж мала ёсць такіх авечак? Ах, толькі смех глядзець на іх* (Я. Купала); *У святую нядзельку са званіцы царкоўнай праваслаўных авечак зазывалі званы* (Т. Кляшторны); *«Авечка ты! – кажу. – Ці ж у гэтым прычына? Адумайся, паварушы мазгамі»* (І. Грамовіч), ‘някемлівы, няспрытны чалавек; разява’: *Ну што, цяцера, атрымала?* (А. Гара); *Ён называў яе неразумнай цяцерай* (Р. Сабаленка), ‘задзірысты чалавек, забіяка’: *Ты задзірысты певень. – А ты рыжая курыца. Яна бяскрыўдна засмяялася* (І. Шамякін). У англійскай мове другасныя пеяратыўныя ЛСВ актуалізуюцца ў зоанімічных назоўніках *donkey, jackass* (бел. *асёл*), *ass* (бел. *ішак*) ‘a stupid, stubborn, or detestable person’ ‘тупы, упарты або агідны чалавек’: *called him a **donkey** when he refused to go along with their plans – называлі яго аслом, калі той адмаўляўся пагаджацца з іх планамі, he was generally disliked and regarded as a pompous **ass** – яго ўвогуле не любілі і ставіліся да яго як да напышлівага ішака, he was an **ass** to her, dissing her script – ён быў ішаком для яе за тое, што адкінуў яе сцэнар.* Асобна трэба адзначыць такія ЛСВ у англійскай мове, як *grouse* (бел. *цяцера*) ‘a complaint or grumble’ ‘скарга або бурчанне’: *our biggest **grouse** was about the noise of construction work – наша самая вялікая цяцера была пра шум будаўнічых работ.*

Рысы хітрасці, ліслівасці выяўляюцца ў беларускім і англійскім субстантывах *ліс, ліса – fox* ‘хітры, ліслівы чалавек’: *Ты стары ліс і хады ўсе ведаеш не горш за свайго пана, але параду маю паслухай* (А. Пальчэўскі); *«Ох і ліса ты, Аксана, не ліса, а пантэра», – гэтак жа вясёла прамовіў Вінцук* (А. Бароўскі), ‘a person who is clever and able to get what they want by influencing or tricking other people’ ‘чалавек разумны і здольны атрымаць жаданае, уздзейнічаючы на іншых людзей або падманваючы іх’: *he's a wily old **fox** – ён хітры стары ліс.* Адначасова з гэтым у англійскай мове ўтварыўся падарожны з такімі якасцямі ЛСВ ‘an attractive young woman’ ‘прывабная маладая жанчына’: *she's a real **fox** – smart, sassy, and sexy – яна сапраўдная ліса – разумная, нахабная і сексуальная.*

Чалавечая рыса здрадлівасці знайшла сваё месца ў намінацыях *ласка – weasel*, дзе толькі ў англійскай мове развіўся ЛСВ ‘a sneaky, untrustworthy, or insincere person’ ‘подлы, ненадзейны або няшчыры чалавек’: *he was a double-crossing **weasel** – ён быў ласкай, які, так сказаць, і нашым і вашым.*

Зоамарфізмы *карова – cow* знаходзяцца ў адносінах частковага супадзення. У беларускай мове *карова* – гэта тоўсты, нязграбны чалавек: *«А ты дзе быў, карова ты? Чаго глядзеў?» – накінуўся на Андрэя п’яны Антось* (Якуб Колас), у англійскай – дурная і надаедлівая жанчына: *You stupid **cow**! – Ты дурная карова! That interfering **old** cow has never liked me – Гэтая надаедлівая старая карова мяне ніколі не любіла.* Толькі ў англійскай мове актуалізуецца ЛСВ ‘an unpleasant person, thing or situation’ ‘непрыемны чалавек, рэч або сітуацыя’: *It's been a **cow** of a day – Гэта была карова дня.*

У плане разумовай абмежаванасці другасныя намінацыі таксама развіліся ў найменнях артэфактаў. Прымета някемлівасці, неразумнасці, бесталковасці, дурноты чалавека выяўляецца ў субстантывах *цурбан, балван, даўбня (доўбня)* ‘пра няцямкага, дурнога чалавека’: *І раптам Валодзю нясцерпна захацелася прымусіць гэтых балваноў выцягнуцца перад ім* (І. Новікаў); *Ах ты, даўбня, каб ты счарнела, як галавешка. Прэч!* (У. Караткевіч). Што датычна англійскай мовы, то ў ёй развіўся другасны ментальны ЛСВ у адпаведніку *dummy*: *Don't just stand there, you **dummy** – Не стой там, балван.* Астатнія прыблізныя адпаведнікі – гэта *blockhead, dumbhead, booby* ‘a very stupid person’ ‘вельмі дурны чалавек’: *Don’t be such a **blockhead / dumbhead / booby**! – Не будзь такім дурнем. Blockhead* складаецца са слоў *block* (калода, цурбан) і *head* (галава). Слова *booby* мае сваё паходжанне ад лацінскага *balbus* ‘заіканне’.

Падобныя па сваёй канатацыі актуалізаваліся ЛСВ для абедзвюх моў у *абух – butt* ‘дурань’: *І гэты абух разумее, што ў хаце яго бацькі не жыццё, а пекла* (А. Чарнышэвіч), ‘to be the person that other people often joke about or criticize; an object of abuse or ridicule’ ‘быць чалавекам з якога іншыя людзі часта жартуюць або якога крытыкуюць; аб’ект абраз або насмешак’: *she was the **butt** of some very unkind jokes – яна была абухом вельмі нядобрых жартаў, the **butt** of all their jokes – абух усіх іх жартаў.*

У беларускай мове прымета неразумнасці часта ўскладняецца семай ‘высокі рост’ *дубіна* ‘тупы някемлівы чалавек’.

У англійскай мове прымета неразумнасці часта ўскладняецца семай ‘вялікая вага’ *lump* (бел. *кусок*) ‘a heavy, lazy or stupid person’ ‘цяжкі, лянівы або дурны чалавек’: *he’s a big fat **lump** – ён вялікі тлусты кусок.*

Назіраюцца поўныя супадзенні ЛСВ у субстантывах *тупіца – hammerhead* ‘тупы, некемлівы, абмежаваны чалавек’: *А большасць жа з нас не тупіцы ад прыроды, хочуць вучыцца, расці* (В. Мыслівец), ‘blockhead; a stupid person’

‘дурны, тупы чалавек’: *Don't be such a* ***hammerhead****! – Не будзь такім тупіцай.*

Глупства часта ўскладняецца такімі маўленчымі маркерамі, як няўменне выразна гаварыць; мнагаслоўнасць, балбатня. Такія рысы характару адлюстроўваюцца ў беларускіх субстантывах *балаболка, трапло* ‘чалавек, які гаворыць лухту, бязглуздзіцу, многа гаворыць’: *Ну і трапло ты, Ваня (Звязда)*, ‘пра таго, хто хутка, многа і абы-што гаворыць’: *Нікому не раскажа, якая б ні была балаболка* (А. Бароўскі). У англійскай мове адпаведнікам з’яўляецца *windbag* (па аналогіі з мехам музычнага інструмента, які доўга і гучна выдыхае паветра) ‘a person who talks at length but says little of any value’ ‘чалавек, які многа гаворыць, але мала чаго каштоўнага’: *a blustering, narcissistic* ***windbag*** *– шумны, самаўлюбёны ветравы мех.* Поўнае супадзенне ЛСВ назіраецца ў словах *трашчотка – rattle* ‘той (тая), хто многа, не сціхаючы, гаворыць; балбатун (балбатуха)’: *Ды што вам гаварыць, трашчоткам* (І. Шамякін), ‘a person who talks incessantly in a lively or inane way’ ‘чалавек, які няспынна размаўляе ажыўлена або бязглуздым чынам’: *I paid no attention to the talk of this* ***rattle*** *– я не звяртаў увагі на тое, што гаварыла гэтая трашчотка.*

Намінацыі, ўтвораныя па мадэлі ‘птушка, якая шчабеча’ → ‘балбатлівы чалавек’. Для намінацый *сарока – magpie* ў беларускай мове ўтварыўся ЛСВ ‘балбатлівы, шумны чалавек’: *І яшчэ сарока сказала, цётачка Анэля, каб тыя пяць тысяч, што вы схавалі пад ліфчык, не аддавалі зяцю ў рукі* (А. Бароўскі). У англійскай мове развіўся ЛСВ ‘a person who obsessively collects things or who chatters idly and noisily’ ‘чалавек, які апантана збірае рэчы або які нічога не робіць, а толькі шумна балбоча’: *media* ***magpies*** *will no doubt seize upon the president's latest gaffe and blow it all out of proportion – медыя-сарокі, несумненна, скарыстаюцца апошняй памылкай прэзідэнта і несуразмерна раздуюць усё гэта.*

У намінацыях *jay* (бел. *сойка*) у англійскай мове саліруе ЛСВ ‘a person who talks at length in a foolish or impertinent way; an impertinent chatterer’ ‘чалавек, які доўга размаўляе па-дурному або нахабна; нахабны балбатун’: *a mere political* ***jay*** *– не больш чым палітычная сойка, I was a* ***jay*** *at school – я быў сойкай у школе.*

Чалавечая загана тупасці выявілася ў ЛСВ у англійскім назоўніку *goose* (бел. *гусь*) ‘a silly person’ ‘дурны чалавек’: *don't be such a silly* ***goose*** *– you're dressed just fine for the party – не будзь такой дурной гуссю – ты проста добра адзета для вечарынкі.*

Найменні дрэў і раслін могуць таксама выступаць у якасці крыніцы метафарычнай экспансіі. Да ліку такіх фітонімаў адносіцца беларускі субстантыў *дуб*, які мае энантыясімічнае (процілеглае) значэнне: дуб – гэта моцны высокі чалавек і ў той жа час тупы, неразумны чалавек. У англійскім адпаведніку *oak* другасныя ЛСВ не развіліся. У асіметрычных адносінах знаходзяцца *перац, пень* ‘колкі, з’едлівы’ чалавек. У англійскай мове другасныя ЛСВ адсутнічаюць па прычыне таго, што перац у моўнай свядомасці англічан успрымаецца перш за ўсё як прыправа, а не агародная расліна. У беларускай мове для ўтварэння другаснага ЛСВ субстантыва *пень* ‘дурны або бяздушны чалавек’ паслужылі такія семы, як ‘старасць, трухлявасць’, *аскалёпак* ‘некультурны, адсталы чалавек’, *калода* ‘пагардліва пра непаваротлівага, нязграбнага чалавека’, *бервяно* ‘дурнаваты, неадукаваны чалавек’.

Мадэль семантычнай дэрывацыі ‘назва ежы’ → ‘слабавольны, нерашучы чалавек’ адзначана ў субстантывах *кісель* і *размазня* ‘слабавольны, нерашучы чалавек’. Англійскія адпаведнікі *pepper, stump* у слоўніках адзначаюцца як монасімічныя, без другасных ЛСВ.

Такім чынам, для найменняў чалавека і яго разумовых здольнасцей і звязаных з імі маўленчых уменняў, пэўных рысаў характару ў беларускай мове актыўна выкарыстоўваюцца намінацыі жывёл, найменні раслін, артэфактаў, ежы і інш. У колькасным плане другасныя ЛСВ больш прадстаўлены ў беларускай мове (больш трыццаці словаў), у той час як у англійскай мове такіх ЛСВ выяўлена толькі 25. У залежнасці ад сэнсавай напоўненасці беларускіх і англійскіх другасных ЛСВ вылучаюцца группы з адносінамі эквівалентнасці (*сарока – magpie, тупіца – hammerhead, трашчотка – rattle*), частковай адпаведнасці ў больш за 20 лексічных адзінак і безэквівалентнасці, калі другасныя ЛСВ развіліся толькі ў адной мове (бел. *дубіна, балаболка, трапло*; англ. *weasel, lump, grouse*). У якасці прыкладу семантычнай неадпаведнасці можна прывесці слова *курыца*, другасны ЛСВ якога ўказываюць у беларускай мове на неразумную жанчыну, у той час як у англійскай мове для такога абазначэння чалавека будзе выкарыстаны субстантыў *goose*.

Литература

1. *Алефиренко, Н. Ф.* Лингвокультуральная природа ментальности / Н. Ф. Алефиренко // Язык. Словесность. Культура. – 2011. – № 1. – С. 23– 42.
2. *Гак, В. Г.* Пространство мысли (опыт систематизации слов ментального поля) / В. Г. Гак // Логический анализ языка. Ментальные действия. – М.: Наука, 1993. – С. 22–29.
3. *Колесов, В. В.* Русская ментальность в языке и тексте / В. В. Колесов. – СПб. : Петербургское востоковедение, 2006. – 624 с.

References

1. *Alefirenko, N. F.* Lingvokul'tural'naya priroda mental'nosti / N. F. Alefirenko // Yazyk. Slovesnost'. Kul'tura. – 2011. – № 1. – S. 23– 42.
2. *Gak, V. G.* Prostranstvo mysli (opyt sistematizacii slov mental'nogo polya) / V. G. Gak // Logicheskij analiz yazyka. Mental'nye dejstviya. – M.: Nauka, 1993. – S. 22–29.
3. *Kolesov, V. V.* Russkaya mental'nost' v yazyke i tekste / V. V. Kolesov. – SPb. : Peterburgskoe vostokovedenie, 2006. – 624 s.

4. *Мишин, А. А.* Концепты «ум» и «глупость» в немецкой и английской языковой картинах мира: автореф. дис. ... канд. филол. наук ; 10.02.20 / А. А. Мишин. – Владимир. гос. ун-т, 2007. – 22 с.
5. *Омельченко, С. Р.* Типология ментальности в лингвистике / С. Р. Омельченко // Русский язык: исторические судьбы и современность. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 2010. – С. 265–266.
6. *Рядчикова, Е. Н.* Ментальные слова русского и английского языков / Е. Н. Рядчикова, С. Ш. Схаляхова, О. В. Телегина // Вестник Майкопского государственного технологического университета : научный журнал МГТУ. – 2010. – № 3. – С. 101–109.
7. *Телегина, О. В.* Проявление специфики ментального пространства языка при отражении реального и виртуального миров / О. В. Телегина // Вестник Майкопского государственного технологического университета : научный журнал МГТУ. – 2010. – № 2. – С. 61–65.
8. *Ширшиков, В. Б.* Концепт «глупый» в русской и английской фразеологии / В. Б. Ширшиков // Романо-германская филология : Межвуз. сб. науч. трудов – Саратов : Изд-во Сарат. ун-та, 2005. – Вып. 5 – С. 153–160.
9. *Ширшиков, В. Б.* Семантическая организация концепта «глупый» в английском и русском языках / В. Б. Ширшиков // Лингвометодические проблемы преподавания иностранных языков в высшей школе : сб. науч. тр. / под ред. Л. И. Сокиркиной. – Саратов : Изд-во Сарат. ун-та, 2005. – Вып. 1. – С. 89–92.
10. *Демьянков, В. З.* Ментальный язык / В. З. Демьянков // Краткий словарь когнитивных терминов. – М. : МГУ, 1996. – С. 99–101.
11. *Старычонак, В. Д.* Мнагазначнасць слова ў беларускай мове : у 3-х кн. / В. Д. Старычонак. – Мінск : Колорград, 2017. – Кн. 2. Семантычная прастора чалавека ў мове і маўленні. – 349 с.
12. *Никитина, Л. Б.* Категориальные семантические черты образа *homo sapiens* в русской языковой картине мира / Л. Б. Никитина. – Омск : Изд-во ОмГПУ, 2004. – 148 с.

4. *Mishin, A. A.* Koncepty «um» i «glupost'» v nemeckoj i anglijskoj yazykovoj kartinah mira: avtoref. dis. ... kand. filol. nauk ; 10.02.20 / A. A. Mishin. – Vladimir. gos. un-t, 2007. – 22 s.
5. *Omel'chenko, S. R.* Tipologiya mental'nosti v lingvistike / S. R. Omel'chenko // Russkij yazyk: istoricheskie sud'by i sovremennost'. – M. : Izd-vo Mosk. un-ta, 2010. – S. 265–266.
6. *Ryadchikova, E. N.* Mental'nye slova russkogo i anglijskogo yazykov / E. N. Ryadchikova, S. Sh. Skhalyahova, O. V. Telegina // Vestnik Majkopskogo gosudarstvennogo tekhnologicheskogo universiteta : nauchnyj zhurnal MGTU. – 2010. – № 3. – S. 101–109.
7. *Telegina, O. V.* Proyavlenie specifiki mental'nogo prostranstva yazyka pri otrazhenii real'nogo i virtual'nogo mirov / O. V. Telegina // Vestnik Majkopskogo gosudarstvennogo tekhnologicheskogo universiteta : nauchnyj zhurnal MGTU. – 2010. – № 2. – S. 61–65.
8. *Shirshikov, V. B.* Koncept «glupyj» v russkoj i anglijskoj frazeologii / V. B. Shirshikov // Romano-germanskaya filologiya : Mezhvuz. sb. nauch. trudov – Saratov : Izd-vo Sarat. un-ta, 2005. – Vyp. 5 – S. 153–160.
9. *Shirshikov, V. B.* Semanticheskaya organizaciya koncepta «glupyj» v anglijskom i russkom yazykah / V. B. Shirshikov // Lingvometodicheskie problemy prepodavaniya inostrannyh yazykov v vysshej shkole : sb. nauch. tr. / pod red. L. I. Sokirkinoj. – Saratov : Izd-vo Sarat. un-ta, 2005. – Vyp. 1. – S. 89–92.
10. *Dem'yankov, V. Z.* Mental'nyj yazyk / V. Z. Dem'yankov // Kratkij slovar' kognitivnyh terminov. – M. : MGU, 1996. – S. 99–101.
11. *Starychonak, V. D.* Mnagaznachnasc" slova w bjelaruskaj movje : u 3-h kn. / V. D. Starychonak. – Minsk : Kolorgrad, 2017. – Kn. 2. Sjemantychnaja prastora chalavjeka w movje i mawljenni. – 349 s.
12. *Nikitina, L. B.* Kategorial'nye semanticheskie cherty obraza *homo sapiens* v russkoj yazykovoj kartine mira / L. B. Nikitina. – Omsk : Izd-vo OmGPU, 2004. – 148 s.